УДК 821.134.2(09)

# «ЧАЛАВЕК-МАСА» ЯК АСНОЎНАЯ КАТЭГОРЫЯ ТЭОРЫІ САЦЫЯЛЬНАЙ КАМУНІКАЦЫІ Ў ТВОРЧАСЦІ ХАСЭ АРТЭГА-І-ГАСЭТА

*Луца Юрый Аляксандравіч*
выкладчык-стажор кафедры паліталогіі і сацыялогіі
навучальнай установы «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова»
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

*У дадзеным артыкуле разглядаецца феномен «масавага чалавека», яго сучасная трактоўка. Масавы чалавек – гэта істота, здольная трансфармавацца пад усе рэаліі жыцця. Пры разглядзе дадзенага феномена былі вызначаны спосабы разумення чалавекам свету, растлумачана паняцце «масавізацыя» ў навуцы шляхам размежавання «спецыяліста» і простага «грамадзяніна».*

95 год таму ўпершыню ў свет выйшла кніга іспанскага філосафа і сацыёлага Хасэ Артэга-і-Гасэта «Паўстанне мас». Здавалася б, гэта ўсяго толькі чарговая дата з моманту выхаду кнігі. Ды і колькі іншых гістарычных падзей адбылося ў гэты год! Але не ўсё так проста, бо «Паўстанне мас», безумоўна, з'яўляецца сацыялагічным бестселерам, які разглядае актуальныя праблемы сучаснага стану камунікавістыкі, аб чым пойдзе размова далей у артыкуле.

Гісторыя напісання твора «Паўстанне мас» была цесна пераплецена з новым этапам у развіцці Іспаніі напачатку 1930-х гадоў. Падзеі Грамадзянскай вайны і палітычнай нестабільнасці на радзіме філосафа ўнеслі ўклад у змяненне грамадскіх адносін, у тым ліку і пытанняў міжасабовых камунікацый. Так, на думку В. В. Краснаяравай, значны ўклад зрабілі агульнасусветныя тэндэнцыі імклівага развіцця заходняй цывілізацыі, якія «не давалі спакою дапытліваму розуму філосафа і яго тонкай душы» [1, с. 189].

Да тэмы «мас», акрамя Хасэ Артэга-і-Гасэта, ужо звярталіся іншыя навукоўцы. Напрыклад, французскія сацыёлагі і сацыяльныя псіхолагі Г. Лебон і Г. Тард. Прычым абодва разглядалі «масу» як «навалу людзей, галоўнай рысай якой з'яўляецца страта здольнасці назіраць» (пер. *Л. Ю.*) [2, с. 59], уключаючы паняцце «натоўп». Менавіта «натоўп»



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з'яўляецца элементарнай формай сацыяльнай масы, стварае ўласнае «духоўнае адзінства», а таксама дае падставы для фарміравання палітычнага лідарства тых, хто здольны валодаць натоўпам.

Інтэрпрэтацыя «масы» ў Х. Артэга-І-Гасэта адрозніваецца ад раней згаданых аўтараў тым, што ён разглядае не столькі «масу», колькі чалавека ў ёй. Гасэт глядзіць на свет вачыма філосафа-экзістэнцыяліста. Ён нібы спрабуе паглядзець ўнутр гэтага натоўпу – таго натоўпу, на які Лебон і Тард глядзелі звонку. Гасэт спрабуе намацаць яго пульс, знайсці ў ім тое патаемнае, што робіць людзей натоўпам... І што філосаф бачыць? Мноства «недыферэнцыяваных індывідаў, не выдзеленых нічым»...

У першым раздзеле, «Феномен статкавасці», аўтар, назіраючы за чалавечым грамадствам, падыходзіць да такой высновы: людзі, якія жылі ў першабытныя часы і якія жывуць зараз, аднолькавыя. Гэта аднолькавасць разглядаецца як нежаданне ніяк вылучацца з натоўпу. Галоўнай прычынай гэтага з'яўляецца «страх перад грамадскасцю» [1, с. 189]. Калі разгледзець гэты феномен, то будзе бачна, што праблема ляжыць у самой аснове. Гэты, можна сказаць, «рэфлекс» перадаўся нам ад жывёл. Яны з дапамогай гэтага метаду ратаваліся ад больш буйных жывёл, драпежнікаў, каб іх не з'елі. Гэты тып паводзін увайшоў і ў наша жыццё.

Вядома, не ўсім хочацца такімі быць. Існуюць людзі, можна сказаць, «антаганісты натоўпу», якія здольныя сваімі паводзінамі не толькі прыцягнуць да сябе ўвагу, зацікавіць натоўп, але і «павесці яго за сабой». І ўсё ж як бы мы ні стараліся назваць агульнымі словамі «меншасць», нам патрэбна спачатку растлумачыць гэта паняцце.

Разглядаючы тэрмін «меншасць», мы заўважаем супрацьстаянне нейкай пэўнай асобе, а можа быць, і нейкай пэўнай групе, масе. «Меншасць» імкнецца прадэманстраваць сваю веліч над звычайным чалавекам. Кожны чалавек, асабліва той, які ідзе на поваДзе грамадства, пачынае параўноўваць сябе з гэтай элітарнай меншасцю, задаючы сабе пытанні: «А ці ёсць у мяне такая здольнасць, якая ёсць у гэтай меншасці? Ці ёсць у мяне нешта такое, што зможа вылучыць мяне з вялікай колькасці людзей?» Часта сам чалавек пачынае сябе адчуваць шэрасцю ў гэтым велізарным свеце. *«У пошуках хлеба, – піша аўтар, – падчас галодных бунтаў народныя натоўпы звычайна грамяць пякарні. Гэта можа служыць правобразам паводзін цяперашніх мас у дачыненні да ўсёй цывілізацыі, якая іх корміць. Прадстаўленая сваім інстынктам, маса, у імкненні палепшыць сваё жыццё, звычайна сама руйнуе крыніцы гэтага жыцця»* (*пер. Л. Ю.*) [3, с. 17].

Можна заўважыць, што тэрмін «паўстанне масс» быў выкарыстаны ўпершыню Ніцшэ, але не ў тым кантэксце, у якім ужываецца ў Гасэта. Ніцшэ адносіў дадзенае паняцце да мастацтва. Гасэт жа выводзіць яго ў сацыяльны кантэкст: маса – гэта пасрэднасць. Характарызавалася і характарызуецца яна наступнай галоўнай якасцю: *«Калі хтосьці не такі, як усе, калі хто-небудзь думае не так, як усе, – рызыкуе стаць ізгоем»*. Так адбываецца і цяпер.

Маса – гэта не колькасць, а якасць! Калі нас многа – гэта яшчэ не маса. Масай нас стварае стан душы, якая згодна плысці па цячэнню і не высоўвацца. Менавіта гэты асаблівы тып чалавека, які будуецца на вось такой «якасці», і ўвайшоў у навуковы абарот дзякуючы Гасэту як «чалавек-маса». Пад «чалавекам-масай» разумеецца «сярэдні чалавек» [3, с. 11], здольны не адрознівацца ад астатніх, які паўтарае агульны тып. У далейшым аўтар задаецца пытаннем: «Які сэнс у гэтым пераходзе колькасці ў якасць?» Але адказ на гэтае пытанне з'яўляецца «найпростым», таму што, дзякуючы гэтаму пераходу, падзелу, усё выразней прасочваецца паходжанне масы.

Разглядаючы псіхалогію «масы», неабходна прасачыць і яе псіхалагічную рэальнасць. *«Маса – усялякі і кожны, хто ні ў дабрыні, ні ў зле не мерае сябе асаблівай мерай, а адчувае такім жа, як і ўсе, і не толькі не прыгнечаны, але задаволены ўласным неадрозненнем»* (пер. *Л.Ю*) [3, с. 12].

У далейшым аўтар вызначае псіхалагічны малюнак «чалавека-масы», які складаецца з дзвюх рыс: першая – гэта бесперашкодны рост жыццёвых запытаў і другая – прыроджаная няўдзячнасць да ўсяго, што здолела палегчыць яго жыццё. Два гэтыя крытэрыі малююць нам чалавека як распешчанае дзіцяці. Пястота, па разважанні аўтара, з'яўляецца самай галоўнай праблемай чалавека. *«Песціць – гэта значыць патураць, падтрымліваць ілюзію, што ўсё дазволена і нішто не абавязкова. Дзіця ў такой абстаноўцы пазбаўляецца паняццяў аб сваіх межах. Пазбаўленае ад любога ціску звонку, ад любых сутыкненняў з іншымі, яно і сапраўды пачынае верыць, што існуе толькі яно, і прывыкае ні з кім не лічыцца, а галоўнае, нікога не лічыць лепш за сябе. Адчуванне чужой перавагі выпрацоўваецца толькі дзякуючы камусьці больш моцнаму, хто змушае стрымліваць, сціщаць і душыць жаданні. Так засвойваецца найважнейшы ўрок: "Тут канчаюся я і пачынаецца іншы, які можа больш, чым я. У свеце, відавочна, існуюць двое: я і той іншы, хто вышэйшы за мяне"»* (пер. *Л.Ю.*) [1, с. 54].

А што ж адбываецца з душой «масавага чалавека»? Аўтар разглядае душу масавага чалавека як «закаркаваную». Менавіта гэта «закаркаванне» прывядзе да з'яўлення новага прынцыпу: «масавы чалавек як дасканалы від» (пер. *Л.Ю*) [3, с. 59]. Стандартны від чалавека, які дзейнічае і думае, як «усе», і не перажывае праз гэта, і ёсць спараджэнне сучаснай цывілізацыі. Ён успрымае выгоды цывілізацыі як тое, што само сабой разумеецца, як натуральны дадзены стан. Ён занадта лянівы, каб турбаваць сябе крытычным мысленнем, ды і не заўсёды здольны да яго.

Каго ж супрацьпастаўляе Гасэт «чалавеку-масе». Ён супрацьпастаўляе ёй... Так, чалавека эліты! Але якой эліты? Палітычнай? Бізнес-эліты? Не, ён супрацьпастаўляе чалавеку-масе чалавека-падзвіжніка. Таго, хто можа ісці супраць плыні, таго масавага чалавека, які больш за ўсё на свеце менавіта адказнасці і баіцца!

Такім чынам, «Паўстанне мас» з'яўляецца кнігай-адказам, дзе крытыкуецца грамадства, якое стала ў свой час «статкам», праз прызму гісторыі, а сфарміраваны «чалавек-маса» – новым тыпам душы, у якой мала агульнага з сусветнай культурай і мараллю.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Красноярова, О. В. К вопросу о коммуникативной стратегии современного массового общества / О. В. Красноярова // Известия Байкальского гос. ун-та. – 2010. – № 5(73). – С. 188–192.
2. Лебон, Г. Психология народов и масс / Г. Лебон. – СПб. : Макет, 1995. – 229 с.
3. Ортега-и-Гассет, Х. Восстание масс / Х. Ортега-и-Гассет. – М. : АСТ, 2003. – 211 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова